На наш погляд, удасканаленню практыкі садзейнічалі б наступныя меры.

Мастацкім кафедрам трэба паўней забяспечваць практыкантаў метадычнымі матэрыяламі, перш за ўсё праграмамі педагагічнай практыкі па спецыялізацыі.

Трэба сканцэнтраваць праходжанне педагагічнай практыкі студэнтаў кожнай з мастацкіх кафедраў на адной-дзвюх базах практыкі, дзе працавалі б пастаянна кіраўнікі ад базы і кафедры. Кіраўніцтва ад кафедры мэтазгодна засяродзіць у руках аднаго-двух выкладчыкаў. Гэта спрыяла б павышэнню адказнасці кіраўнікоў за якасць падрыхтоўкі практыкантаў. Неабходна надаваць больш увагі азнаямленню студэнтаў з планаваннем, авалоданню методыкай арганізацыі выхаваўчай работы на базах практыкі, умацаванню іх узаемасувязей. Лічым патрэбным абавязковае праходжанне педагагічнай практыкі студэнтамі 4 курса ў летнім аздараўленчым лагеры.

**Ушакова В.М.**, дацэнт

## СТАНАЎЛЕННЕ ПРАФЕСІЙНАГА МАЙСТЭРСТВА ПЕДАГОГА Ў СІСТЭМЕ ШМАТУЗРОЎНЕВАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Перыяд практычнага засваення педагагічнай прафесіі ў сістэме шматузроўневай падрыхтоўкі спецыялістаў дазваляе набываць дадатковую кваліфікацыю педагога ў пэўнай прафесійнай галіне. Мэтай у дадзеным выпадку з'яўляецца падрыхтоўка спецыяліста да самастойнай педагагічнай працы ў навучальнай установе.

Гэты перыяд дазваляе актывізаваць рэсурсы асобы ў авалодванні педагагічнымі інавацыямі. Значыць, ёсць магчымасць прафесійнага развіцця здольнасцей будучых спецыялістаў, станаўлення педагагічных стыляў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сувязі з бесперапыннай педагагічнай падрыхтоўкай спецыяліста ў ВНУ ў якасці задач разглядаюць наступныя. Перш за ўсё ажыццяўленне бесперапыннай педагагічнай адукацыі. Па-другое, замацаванне, паглыбленне тэарэтычных ведаў, атрыманых пры вывучэнні гуманітарных, фундаментальных, спецыяльных дысцыплін у прафесійнай, вучэбна-выхаваўчай дзейнасці.

Неабходным для кіравання вучэбна-выхаваўчым працэсам, вырашэння дыдактычных праблем з'яўляецца набыццё будучымі спецыялістамі ведаў, уменняў па адборы, структураванні зместу адукацыі.

Будучы педагог павінен умець: арганізоўваць зносіны са студэнтамі, ажыццяўляць аналіз педагагічнага ўздзеяння, выконваць карэкцыю паводзін. Набывае асаблівую важнасць фарміраванне ў спецыялістаў патрэбы ў самастойным ажыццяўленні даных відаў дзейнасці. Гэтая мэта дасягаецца вывучэннем цыкла псіхолага-педагагічных дысцыплін, выкарыстаннем на практыцы адпаведных ведаў, уменняў, навыкаў з улікам сацыяльна-прафесійнага фону іх выкарыстання.

Выпрацоўка прафесійных навыкаў, уменняў садзейнічае фарміраванню прафесійнага майстэрства. Гэта забяспечвае паэтапную рэалізацыю ўказанай мэты ў праграмах, аб'ектах прафесійнай дзейнасці.

Прынцыпамі арганізацыі педагагічнай практыкі ў сістэме бесперапыннай адукацыі з'яўляюцца:

— сувязь, пераемнасць педагагічнай практыкі са зместам навучання ў ВНУ;
— забеспячэнне адзінства і пераемнасці дыдактычных, метадычных, тэхналагічных асноў педагагічнай дзейнасці пры распрацоўцы і правядзенні вучэбна-выхаваўчых мерапрыемстваў з вучнямі;
— асэнсаванне будучымі педагогамі ў перыяд праходжання практыкі праблем педагогікі супрацоўніцтва суб'ектаў навучання.

Змест практыкі з пункту гледжання будучай работы педагога ўяўляе частку прафесійнага вопыту, уключае вучэбна-дапаможную, даследчыцкую дзейнасць. Ён вызначаецца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучэбнымі планамі, праграмамі падрыхтоўкі спецыялістаў, магістраў. У сістэме бесперапыннай падрыхтоўкі ствараюцца ўмовы для фарміравання навыкаў даследчыцкай дзейнасці: ажыццяўляецца ўдасканаленне ў студэнтаў навыкаў правядзення даследчых работ, фарміруецца вопыт педагагічных пошукаў у праектаванні прафесійнай адукацыі.

Калі накіраванасць педагагічнай практыкі студэнтаў набывае псіхолага-педагагічны характар, то для магістраў лічыцца прымальнай навукова-даследчыцкая арыентацыя ў прафесійнай галіне. Мэтазгодна далучаць магістраў да навукова-даследчых работ кафедраў у ВНУ. У распрацоўцы, выкананні псіхолага-педагагічных заданняў са спецыяльнымі кафедрамі магістры набываюць навык самастойнага даследавання педагогікі прафесійнай дзейнасці.

Аснову вопыту па спецыяльнасці складае ўменне сфармуляваць вынікі дзейнасці з улікам узроўню складанасці, зместу адукацыі.

Тэарэтыка-метадычныя дысцыпліны, што складаюць практычную падрыхтоўку студэнтаў, павінны забяспечыць апераджальны характар навучання. Аднак пытанне ўзаемасувязі тэарэтычнага і практычнага кампанентаў навучання можна вырашаць з улікам спецыялізацыі. Педагагічная практыка мусіць улічваць сацыяльна-прафесійны фон, у абставінах якога запатрабаванымі аказваюцца канкрэтныя вучэбныя дысцыпліны ў спрыяльных па аб'ёме суадносінах. Да таго ж адлюстроўваюцца глыбіня раскрыцця тэмы, ступень складанасці выхавання прафесійных навыкаў, уменняў.

Сістэма практычнага навучання ўключае і пазааўдыторныя формы дзейнасці будучых педагогаў — педагагічную працу ў дзяржаўных і недзяржаўных навучальных установах, стажыроўкі рознай прафесійнай скіраванасці і інш.

Вынікі тэарэтычнай і практычнай педагагічнай падрыхтоўкі ёсць сэнс улічваць пры вызначэнні магчымасці студэнтаў, магістраў вучыцца ў аспірантуры.

Такім чынам, вышэйшая педагагічная адукацыя ў наш час не павінна быць прыярытэтам педагагічных ВНУ. Яе даступнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маглі б забяспечваць тыя вучэбна-навуковыя ўстановы, у якіх адбываецца шматузроўневая падрыхтоўка спецыялістаў. Арганізацыя гэтай падрыхтоўкі абумоўлена патрэбай грамадства ва ўзгадаванні педагагічных кадраў розных кваліфікацыйных узроўняў для сістэмы прафесійнай адукацыі.

## РЭКАМЕНДАЦЫІ
### па далейшым удасканаленні якасці арганізацыі і правядзення практыкі студэнтаў

1 кастрычніка 1997 года адбыўся семінар прафесарска-выкладчыцкага саставу па тэме "Павышэнне эфектыўнасці практыкі як асноўнага сродку прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў". У семінары ўдзельнічалі, акрамя прадстаўнікоў кафедраў, кіраўнікі практыкі — супрацоўнікі базавых устаноў сацыякультурнай сферы, навучальных устаноў і інш. Прысутнічалі кіраўнікі практыкі Віцебскага, Гродзенскага вучылішчаў культуры і мастацтваў, Мінскага педагагічнага універсітэта імя М.Танка, Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума, дырэктары, намеснікі дырэктараў бібліятэк, Палацаў культуры, сярэдніх школ, дзіцячых музычных школ і інш. Усяго ў семінары прымалі ўдзел 58 кіраўнікоў практыкі. З паведамленнямі аб вопыце работы выступілі 18 чалавек. У іх выступленнях была дадзена станоўчая ацэнка дзейнасці кафедраў па арганізацыі, правядзенні ўсіх відаў практыкі. Былі таксама выказаны рэкамендацыі, прапановы па далейшым удасканаленні якасці вучэбнай вытворчай, педагагічнай практыкі.

На падставе выступленняў, меркаванняў удзельнікаў семінара складзены пералік наступных мер па далейшым удасканаленні вучэбнай, вытворчай, педагагічнай практыкі.

Прафесарска-выкладчыцкаму саставу большую ўвагу ўдзяляць вырашэнню праблем арганізацыі і правядзення практыкі, адной з важных састаўных частак вучэбнага працэсу прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў. Практыка арганічна